***Арганізацыя полімастацкага асяроддзя ва ўстановах дашкольнай адукацыі мае свае асаблівасці. Галоўнымі арыенцірамі для ўдзельнікаў асяроддзя, з пункту гледжання аўтара артыкула, могуць стаць дзейнасны падыход і гульнёвы пачатак, у якім спалучацца ўсе кампаненты полімастацкага асяроддзя: музыка, танец, тэатральныя элементы.***

**КАХНОЎСКАЯ Алена Вячаславаўна,** кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

# СТВАРАЕМ ЭТНАКУЛЬТУРНУЮ ПАДЗЕЮ Ў ДЗІЦЯЧЫМ САДКУ: КРОК ЗА КРОКАМ

**Анатацыя.** *У артыкуле разглядаюцца асаблівасці правядзення народнага свята ва ўстанове дашкольнай адукацыі на аснове падзейнага падыходу. Значная ўвага аддаецца ўзаемадзеянню выхавальнікаў і музычных кіраўнікоў у працэсе арганізацыі і правядзення народнага свята як падзеі ў жыцці дзяцей і дарослых.*

***Ключавыя словы:*** *падзейны падыход, народнае свята, дзеці дашкольнага ўзросту, выхавальнікі, музычныя кіраўнікі.*

**Abstract.** *The article presents features of holding a national holiday in a preschool institution on the basics of the event approach. Particular attention is paid to the cooperation between pedagogues and music directors in organizing and holding a folk holiday as an event in the children's and adults' life.*

***Keywords:*** *the event approach, a folk holiday, preschool children, pedagogues, music directors.*

Этнакультурнае выхаванне як адзін з актуальных аспектаў дашкольнай адукацыі мае на мэце фарміраванне ў выхаванцаў этнічнай дасведчанасці, ідэнтычнасці, каштоўнасных адносін да беларускай этнічнай культуры шляхам уключэння ў цэласную, сістэмна арганізаваную выхаваўчую прастору этнакультурнага зместу. Такая прастора ствараецца не сама па сабе, а дзякуючы мэтанакіраванаму ўзаемадзеянню педагагічных работнікаў, а менавіта выхавальнікаў дашкольнай адукацыі і музычных кіраўнікоў. Дапамагчы стварыць прастору этнакультурнага зместу прызваны падзейны падыход.

Тэхналогіі падзейнай адукацыі адносяць да гуманных адукацыйных тэхналогій. Падзейны падыход цесна звязаны з феноменам талерантнасці, трываласці. Гэта заключаецца ў тым, што педагог павінен разумець дзіця, яго матывы, духоўны свет. Дадзены падыход дазваляе варыяваць кірункі, формы выхавання і праектаваць іх у залежнасці ад інтарэсаў і сацыяльных асаблівасцяў дзіцяча-дарослай супольнасці, зместу дзейнасці ўстановы адукацыі. Галоўнае — тэхналагічна ўключаць дзяцей і дарослых у сферу сумеснай культуратворчай дзейнасці.

На думку Г. Б. Карнетава, ***«падзеяй»*** у адукацыйным працэсе ўстановы адукацыі можа стаць нейкая значная, спантанна ўзніклая або спецыяльна сканструяваная сітуацыя, якая забяспечвае яе ўдзельнікам своеасаблівы «псіхалагічны прарыў», выхад за межы існуючага жыццёвага досведу. Роля педагога заключаецца ў кіраванні «падзеяй» як інструментам уздзеяння. «Падзея» звязвае дзяцей і дарослых у адзінае цэлае. Выхаваўчае ўздзеянне ажыццяўляецца не толькі непасрэднымі адносінамі, але і кантэкстам, які задаецца сітуацыяй. З гэтага пункту гледжання задача педагога заключаецца ў арганізацыі менавіта такіх падзей, якія будуць пазітыўна ўплываць на асобу дзіцяці [3].

Рэалізацыя падзейнага падыходу ў педагогіцы прадугледжвае наяўнасць у жыцці дзяцей яскравых, эмацыйна насычаных, незабыўных спраў, якія значныя і прывабныя як для калектыву,

так і для асобы. Гэтыя справы разглядаюцца ў якасці своеасаблівых вех выхаваўчага працэсу, якія ўзнікаюць як інавацыі і паступова робяцца традыцыйнымі [5, с. 36]. Педагагічная падзея разглядаецца як момант рэальнасці, у якім адбываецца развіццёвая, мэтанакіраваная і каштоўнасна арыентаваная сустрэча дарослага і дзіцяці. Гэты падыход дазваляе арганізаваць выхаваўчы працэс на аснове сумеснай дзейнасці, пабудаванай на прынцыпах дыялогу, агульных каштоўнасцей, што спрыяе дасягненню агульнай мэты, адкрытых і канструктыўных зносін, раўнапраўя ў сумеснай культуратворчай дзейнасці [5].

Стварыць прастору этнакультурнага выхавання ва ўстанове дашкольнай адукацыі на аснове падзейнага падыходу дапаможа ***народнае свята*** або забава як падзея ў жыцці дзяцей і дарослых, а таксама асноўная форма трансляцыі і ўзнаўлення этнічнай культуры беларусаў. Народнае свята павінна быць арыентаванае на стварэнне ўмоў для індывідуальнага самавызначэння дзіцяці, фарміравання асабістай культуры і асабістага эстэтычнага густу. Акрамя таго, прынцып узаемасувязі розных відаў мастацтваў (полімастацкасць) у працэсе падрыхтоўкі і правядзення народнага свята дапаможа стварыць эмацыянальна-вобразную атмасферу, якая забяспечыць аптымальнае развіццё мастацкага мыслення выхаванцаў праз інтэграцыю выяўленчага, музычнага, тэатральнага мастацтваў, мастацкай літаратуры і інш.

У сваю чаргу, сумесная культуратворчая дзейнасць выхавальніка і музычнага кіраўніка падчас падрыхтоўкі да народнага свята як падзеі грунтуецца на вызначэнні наступных ***складнікаў***:

- мэта і задачы кожнага з этапаў падрыхтоўкі і правядзення народнага свята як падзеі;
- удзельнікі этнакультуратворчага ўзаемадзеяння і іх ролі (функцыі) у працэсе падрыхтоўкі і правядзення народнага свята;
- віды дзейнасці, найбольш характэрныя для этнакультурнай сітуацыі выхавання;
- сродкі (сумесны адбор, распрацоўка) і асаблівасці іх выкарыстання падчас падрыхтоўкі і правядзення народнага свята;
- этнічна выражанае прадметнае напаўненне лакальнай этнакультурнай прасторы;
- каштоўнасныя арыентацыі, мадэлі сумеснай творчай камунікацыі і правілы камунікацыйных паводзін суб'ектаў прасторы этнакультурнага выхавання ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення народнага свята.

Планаванне народнага свята як падзеі ў жыцці дзяцей і дарослых ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі складаецца з некалькіх этапаў, якія рэалізуюцца сумеснымі намаганнямі выхавальнікаў і музычных кіраўнікоў.

**1-ы этап — падрыхтоўчы:**

- вывучэнне мясцовых асаблівасцей і ўмоў, неабходных для правядзення народнага свята, а таксама выхаваўчых і этнакультуралагічных магчымасцей установы адукацыі, сацыякультурнага асяроддзя і сем'яў выхаванцаў;
- вызначэнне мэты і задач у дачыненні да падрыхтоўкі і правядзення народнага свята як падзеі ў жыцці дзяцей і дарослых;
- вызначэнне мэтаў і задач адносна дзяцей, бацькоў (законных прадстаўнікоў выхаванцаў), педагагічных работнікаў, якія будуць задзейнічаны ў свяце.

Паколькі падзея ва ўстанове дашкольнай адукацыі не можа адбыцца без актыўнага ўзаемадзеяння розных суб'ектаў адукацыйнага працэсу, яе арганізацыя разглядаецца з розных пазіцый: праца з дзецьмі дашкольнага ўзросту, праца з бацькамі (законнымі прадстаўнікамі) выхаванцаў, праца з педагагічнымі работнікамі, праца з прадстаўнікамі іншых сацыякультурных устаноў.

**2-і этап — плануючы:**

- вызначэнне галоўнай ідэі народнага свята;
- вызначэнне асабістага месца выхавальніка, музычнага кіраўніка ў агульнай этнакультуратворчай прасторы падчас падрыхтоўкі да свята;
- размеркаванне функцый паміж усімі суб'ектамі, што ўключаны ў працэс падрыхтоўкі і правядзення свята;
- сумесная распрацоўка падрабязнага сцэнарыя народнага свята (ініцыятыўная група).

*Табліца* — **Прыблізная форма планавання народнага свята**

| № п/п | Назва свята, кароткае апісанне, тэрмін правядзення | Змест дзейнасці | Адказны | Заўвагі / Рэкамендацыі |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Улічваючы асаблівасці светабачання дзяцей дашкольнага ўзросту, акцэнты святочнай падзеі неабходна рабіць на казцы (яе драматызацыі, перажыванні выхаванцамі сюжэта), рухах (танцах, карагодах), гульні (слоўнай, рухомай, музычнай і інш.), творчасці (рухальнай, маўленчай, музычнай і інш.) [4, с. 51].

Значная ўвага аддаецца вывучэнню літаратурных крыніц, падбору тэкстаў песень, інструментальнага і харэаграфічнага матэрыялаў, карагодных гульняў і інш.

***Задача выхавальніка*** — планаванне адукацыйнага працэсу такім чынам, каб ён быў звязаны з надыходзячым святам; падрыхтоўка ўступнай гутаркі, якая дапаможа растлумачыць выхаванцам сэнс пэўных абрадаў, незразумелыя словы і выразы; падбор найлепшых узораў літаратурнага мастацтва; сумеснае і індывідуальнае развучванне з дзецьмі тэкстаў вершаў і песень.

***Задача музычнага кіраўніка*** — падбор найлепшых узораў музычнага мастацтва, інструментальнага і харэаграфічнага матэрыялаў; сумеснае і індывідуальнае развучванне з дзецьмі тэкстаў вершаў і песень.

На думку І. Э. Куліковай, святам (падзеяй) пры пэўнай арганізацыі можа выступаць і слуханне народнай музыкі, песень, прагляд відэазапісу народных танцаў, карагодаў, што з'яўляецца асновай асабістых дзеянняў дзіцяці. Значным такое сумеснае слуханне (або проста прагляд) становіцца ў тым выпадку, калі да яго была сумесная падрыхтоўка дзяцей і дарослых: падрыхтоўка памяшкання для прагляду і слухання, касцюмаў, дэкарацый для драматызацыі і інш. [4].

Што тычыцца народнай музыкі, песень, скокаў — менавіта праз іх перадаваліся ў народзе радасць і задавальненне. У іх сканцэнтравана мудрасць беларускага народа, выяўляецца яго душа, адлюстроўваецца побыт і этыкетныя формы. Музычны твор дае магчымасць дзіцяці адчуць і ўспрыняць не проста які-небудзь устойлівы і нерухомы, хоць і самы найлепшы, найпрыгажэйшы вобраз, а наадварот, ён малюе перад выхаванцам само ўзнікненне гэтага вобраза і ў той жа час яго знікненне. Гульня з музычным гукам робіцца для дзіцяці спосабам выражэння сваіх уяўленняў пра навакольны свет — узнаўленне музычнай сітуацыі (фрагмента) і музычнага вобраза ў адпаведнасці з вобразам свету, які ўзнік унутры яго [4, с. 43]. Задача педагогаў — арганізаваць такое мерапрыемства, якое станоўча паўплывае на развіццё асобы дзіцяці дашкольнага ўзросту.

**3-і этап — рэалізацыйны:**

- праца па падрыхтоўцы атрыбутаў да свята і касцюмаў для выхаванцаў сумесна з бацькамі;
- афармленне і аздабленне памяшкання для правядзення свята;
- выраб паштовак-запрашэнняў, падарункаў-сюрпрызаў блізкім і родным;
- непасрэднае правядзенне народнага свята.

Пашырэнне кола зносін паміж суб'ектамі этнапрасторы адбываецца ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення народнага свята. Усе ўдзельнікі культурнай камунікацыі далучаюцца да культуратворчасці праз наступныя сродкі: песня, гульня, казка, загадка, мастацкая дзейнасць. Выхаванцы, як правіла, ахвотна ўзаемадзейнічаюць з аднагодкамі і дарослымі, што становіцца падмуркам для раскрыцця іх асобы. Святы забяспечваюць рознабаковасць выхавання, дзеці вучацца спецыяльным рытуальным дзеянням, падпарадкоўваюць свае паводзіны агульнай культуры зносін, развіваюць эстэтычныя пачуцці, у іх фарміруецца станоўчае стаўленне да этнічнай культуры.

*Падрыхтоўка да свята* павінна пачынацца загадзя на спецыяльных вячорках у вольны ад заняткаў час, што дазволіць стварыць атмасферу даверу, талерантнасці, дыялогу. Выхаванцы атрымоўваюць больш глыбокія веды пра побыт беларускага народа. Дзеці і дарослыя знаёмяцца з каштоўнасным зместам і гісторыяй свята, традыцыямі святкавання, абрадавай ежай і інш.

*Галоўная мэта* такіх мерапрыемстваў заключаецца ў стварэнні ўмоў для спазнання і практычнага засваення культурных каштоўнасцей свята, фарміравання навыкаў зносін дзяцей з дарослымі і аднагодкамі падчас падрыхтоўкі да свята, развіцця асабістых традыцый і эмацыянальнага камфорту ў сумеснай этнакультуратворчай дзейнасці. З мэтай павышэння цікавасці выхаванцаў на вячоркі «запрашаюцца» розныя персанажы (у першую чаргу — міфалагічныя), ствараюцца ўмовы для рознаўзроставых зносін, што забяспечвае трансляцыю старэйшымі дзецьмі сваіх уяўленняў пра этнакультуру малодшым —



у гэтым закладзены галоўны прынцып народнай педагогікі. ***Асноўныя віды культуратворчай дзейнасці*** — гэта развучванне песень, карагодаў, гульняў; выраб атрыбутаў, неабходных для свята; аздабленне памяшкання (беларуская хата, зала і інш.); выраб паштовак-запрашэнняў, падарункаў-сюрпрызаў блізкім (родным, сябрам). У працэсе падрыхтоўкі да свята пажадана арганізаваць некалькі вячорак. Абапіраючыся на работы Л. В. Какуевай [2], лічым мэтазгодным планаваць ***вячоркі*** у тры этапы:

- спазнавальная гутарка з дзецьмі;
- практычная дзейнасць дзяцей і дарослых;
- творчыя гульнявыя, музычна-літаратурныя вячоркі.

На вячорках дзеці аб'ядноўваюцца ў падгрупы і выконваюць агульную працу або займаюцца індывідуальна.

Падчас падрыхтоўкі да свята выхаванцы устанаўліваюць яго сувязь з сезоннымі зменамі ў прыродзе, з працай продкаў у мінулым і дарослых у цяперашні час, а таксама са значнымі падзеямі, датамі ў грамадскім жыцці. Выраб атрыбутаў, падарункаў, запрашэнняў садзейнічае развіццю практычных уменняў і навыкаў этнакультуратворчай дзейнасці выхаванцаў. У працэсе падрыхтоўкі і правядзення свята значна пашыраецца слоўнік дзяцей, яны знаёмяцца з новымі паняццямі, прыказкамі, прымаўкамі, заклічкамі, прыгаворамі. У адпаведнасці з месцазнаходжаннем, а значыць мясцовым мастацкім каларытам рэгіёна, выхаванцы сумесна з дарослымі могуць развучваць абрадавыя песні, танцы, карагоды. На такія вячоркі пажадана запрасіць бабуль, бацькоў, сумесна абмеркаваць праграму арганізацыі свята, вызначыць для кожнага ўдзельніка месца ў працэсе яго падрыхтоўкі і правядзення.

Значнай увагі падчас падрыхтоўкі да свята заслугоўваюць ***народныя карагодныя гульні***. Падчас іх правядзення ствараюцца *умовы*:

- для фарміравання каштоўнасных арыентацый (назапашванне ўяўленняў пра тое, як жыве прырода, як працуе чалавек і г. д.);
- камунікатыўнай ідэнтыфікацыі (зносіны дзяцей, якія на падсвядомым узроўні дзякуючы прыкладу і асабістай актыўнасці «прысвойваюць» узоры паводзін дарослых);
- сацыялізацыі дзіцяці ў бліжэйшай этнакультурнай прасторы (паступовы ўваход у соцыум з усведамленнем патрабаванняў да асобы, уменнямі і навыкамі зносін і інш.).



Гульня з'яўляецца не толькі сродкам арганізацыі дзейнасці дзяцей, але і спецыфічным сродкам дыягностыкі іх паводзін і дзейнасці ў этнакультурнай прасторы [1].

Дзякуючы такім падзеям адбываецца ўмацаванне пераемнасці паміж пакаленнямі, засваенне сямейных традыцый, бацькі з большай цікавасцю ставяцца да народных святаў. Падрыхтаваныя сустрэчы выклікаюць у дзяцей усплёск эмоцый, выхаванцы могуць праявіць сябе ў танцы, гульні, чытанні вершаў, тэатралізацыі. Актыўны ўдзел у падзеях дазваляе далучыць дзяцей дашкольнага ўзросту да этнічнай культуры не апасродкавана, а непасрэдна на дзейнасным узроўні. Калі дзіця засвоіла нацыянальныя каштоўнасці, яно ўвасабляе ўсвядомленнае ў дзейнасці (гл. *дадатак*).

Вызначыць узровень сфарміраванасці ў выхванцаў уяўленняў пра этнічную культуру беларусаў, а менавіта пра народныя святы, дапаможа ***педагагічная дыягностыка «Пазнай свята»***.

*Мэта:* вызначыць узровень уяўленняў дзяцей ад 5 да 7 гадоў пра асноўныя народныя святы (паказчыкі: называе атрыбуты свята, адлюстраваныя на малюнку, з цікавасцю апісвае народнае свята).

*Стымульны матэрыял:* 4 малюнкі з выявамі асноўных атрыбутаў да святаў: Багач, Каляды, Масленіца, Гуканне вясны.

*Змест методыкі.* Пакласці малюнкі на стале. Індывідуальна дзіцяці прапануецца заданне: «Разгледзь уважліва малюнкі. Выберы тыя, на якіх адлюстраваны знаёмыя табе рэчы. Назаві іх. Успомні свята, падчас якога выкарыстоўваюцца гэтыя рэчы. Раскажы, што ты ведаеш пра свята. Ці праводзіцца такое свята ў дзіцячым садзе? Як? Ці святкуюць Багач, Каляды, Масленіцу, Гуканне вясны ў тваёй сям'і? Якое са святаў табе найбольш падабаецца? Чаму?».

*Ацэнка вынікаў.* Даследчык ставіць 3 балы, калі дзіця упэўнена называе свята і атрыбуты да яго, эмацыянальна тлумачыць, як яно святкуецца; 2 балы — дзіця называе свята і атрыбуты да яго, пры тлумачэнні дапускае памылкі, але з дапамогай дарослага іх выпраўляе; 1 бал — адказы неканкрэтныя, доўга думае, прапанаваныя малюнкі не выклікаюць цікавасці [1].

**4-ы этап — рэфлексіўны.**

Падвядзенне вынікаў свята адбываецца на аснове аналізу наступных *паказчыкаў*:

- актыўнасць і самастойнасць выхаванцаў у працэсе падрыхтоўкі і правядзення народнага свята;
- індывідуальны падыход да дзяцей падчас падрыхтоўкі і правядзення народнага свята, уключэнне іх у сумесную этнакультуратворчую дзейнасць;
- арыгінальныя знаходкі педагагічных работнікаў (выхавальнікаў, музычных кіраўнікоў) у стымуляванні цікавасці дзяцей да праведзенага мерапрыемства;
- ступень удзелу выхаванцаў розных узроставых груп у сумеснай культуратворчай дзейнасці падчас падрыхтоўкі і правядзення народнага свята;
- творчы ўзровень і якасць работ для конкурсаў і выстаў (пры наяўнасці);
- ступень удзелу бацькоў (законных прадстаўнікоў) выхаванцаў у працэсе падрыхтоўкі і правядзення народнага свята.

Такім чынам, *канструяванне выхаваўчай прасторы этнакультурнага зместу* ва ўстанове дашкольнай адукацыі на аснове падзейнага падыходу можа быць рэалізаванеа праз арганізацыю і правядзенне народнага свята як падзеі ў жыцці дзяцей і дарослых. Такі падыход стварае ўмовы для пабудовы адукацыйнага працэсу на аснове адзінай мэты, якая падзяляецца ўсімі яго ўдзельнікамі — педагагічнымі работнікамі (выхавальнікамі дашкольнай адукацыі, музычнымі кіраўнікамі і інш.), адзінай педагагічнай канцэпцыі, арыентаванай на прыярытэты гуманістычных каштоўнасцей, падзейнасць, дыялогавы рэжым, а таксама культуратворчага развіцця ўсіх суб'ектаў прасторы.

Выхаваўчая прастора як вынік стваральнай дзейнасці яе суб'ектаў існуе ў кантэксце асяроддзя. Стварэнне выхаваўчай прасторы этнакультурнага зместу вядзе да ўзнікнення якасна новых рэсурсаў. Падмуркам для развіцця новых рэсурсаў выхаваўчай прасторы этнакультурнага зместу выступае канструктыўная дзейнасць яе суб'ектаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. *Кахноўская, А. В.* Мадэляванне прасторы этнакультурнага выхавання дзяцей ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі : дыс. ... канд. пед. навук : 13.00.01 / А. В. Кахноўская. — Мінск, 2019. — 222 л.

2. *Кокуева, Л. В.* Духовно-нравственное воспитание дошкольников на культурных традициях своего народа : методическое пособие / Л. В. Кокуева. — М. : АРКТИ, 2005. — 144 с.

3. *Корнетов, Г. Б.* Педагогическая среда: потенциал и проектирование / Г. Б. Корнетов // Школьные технологии. — 2006. — № 3. — С. 23–32.

4. *Куликовская, И. Э.* Технология интегрированного праздника : практическое пособие для методистов и воспитателей дошкольных образовательных учреждений, учителей начальных классов, студентов пед. учеб. заведений, слушателей ИПК. — Ростов-на-Дону : Учитель, 2003. — 128 с.

5. *Селиванова, Н. Л.* Современные представления о воспитательном пространстве / Н. Л. Селиванова // Педагогика. — 2000. — № 6. — С. 35–38.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.04.2021*

***Дадатак***

# «ПЧОЛКА, ПЧОЛКА, ДАЙ НАМ МЁДУ!»

## Забава-падзея

*Задачы*: пазнаёміць дзяцей ад 5 да 7 гадоў з заняткам беларусаў бортніцтвам, народным прысвяткам «Зосім»; развіваць пачуццё эмпатыі да прыродных аб'ектаў, жаданне іх спазнаваць і зберагаць; развіваць хуткасць рэакцыі; выхоўваць цікавасць да народных традыцый, задавальненне ад сумеснай культуратворчай дзейнасці.

*Сродкі рэалізацыі*: малюнкі пчалы, вулляў-борцяў, адзення пчаляра, дымара; маскі-какошнікі для гульні «Пчолы і мядзведзь»; матэрыялы для сумеснай творчай работы-калажу «Пасека».

### План-сцэнарый

**1. Гутарка з дзецьмі на тэму «Зосім — ахоўнік пчол».**

Дзеці сядзяць на крэслах, пастаўленых па крузе (або на дыване).

— У красавіку нашы продкі адзначалі адзін з дзён у гонар Зосіма. Лічылася, што Зосім з'яўляецца ахоўнікам пчол. Паглядзіце, дзеці, як выглядае пчолка. *(Выхавальнік дэманструе малюнак з выявай пчалы, дзеці яго разглядваюць, абмяркоўваюць убачанае.)*

Здаўна тых людзей, якія займаліся доглядам за пчоламі, называлі бортнікамі. Бортнікі наглядалі за дзікімі пчоламі ў лесе. Яны зрабілі з тоўстых калод вуллі-борці (*дэманстрацыя малюнка*) і размяшчалі іх высока на дрэвах.

Але ж адзін з жыхароў лесу быў вельмі ласы на смачны, духмяны мядок. Ён мог залезці нават на высокае дрэва і пачаставацца. Ці ведаеце вы, пра каго я кажу? *(Адказы дзяцей.)* Так, гэта мядзведзь.

**2. Расказванне народнай казкі «Мядзведзь».**

— Ці ведаеце вы, адкуль узяўся мядзведзь?

Мядзведзь раней быў такім жа чалавекам, як і мы. Людзей тады было мала, і жылі яны па лясах. Там палявалі на звяроў і птушак. Улетку збіралі грыбы і ягады, капалі карэнне, назапашвалі на зіму. Але найбольш стараліся назапасіць арэхаў і мёду. Пчол тады было багата. Яны вадзіліся і ў дуплах, і ў зямлі — у норах. Людзі шукалі пчол у дуплах, і хто першы знаходзіў, той абвязваў тое дрэва вяроўкаю, і ўжо ніхто не меў права іх чапаць.

Але жыў у той час адзін чалавек — гультай несусветны. Не хацелася яму самому шукаць пчол, дык ён выдзіраў чужых. Жылося таму гультаю някепска. Стаў ён тоўсты на чужым мёдзе, як калода зрабіўся. Ды вось бяда: цяжка яму стала лазіць на дрэвы па мёд... Пачаў ён думаць, што б такое зрабіць, каб лёгка было лазіць на дрэвы. Ды нічога не мог прыдумаць.

Дачуўся аднойчы гультай, што жыве за сямю лясамі ды за сямю балотамі такі чарадзей, які ўсё можа зрабіць, «Пайду, — думае, — да яго. Можа, ён зробіць мяне лёгкім».

І пайшоў да таго чарадзея. Ідзе лесам, бачыць — ліпа абвязана. Падышоў да яе, а там дупло зусім нізка, і ў ім поўна мёду. Выдраў ён мёд з дупла, наеўся і пайшоў далей. Ідзе, аж неўзабаве трапляецца другая абвязаная ліпа з пчаліным дуплом. Выдраў ён мёд і з гэтага дупла.

Ці шмат дзён ішоў ён, ці мала, нарэшце дайшоў да зямлянкі, дзе жыў той чарадзей. Пастукаўся ў зямлянку — ніхто не адчыняе: няма гаспадара дома. Сеў гультай, сядзіць. Аж бачыць — перад самым носам у яго ліпа з дуплом. Прывык гультай выдзіраць чужых пчол. Не стрымаўся і тут. Толькі ён пачаў драць мёд і ўплятаць за абедзве шчакі, як бачыць — ідзе гаспадар.

Паглядзеў чарадзей на гультая, пакруціў галавою і кажа:

— Ну, чалавеча, за такую благую работу будзеш ты з гэтага часу толькі тое і рабіць, што драць пчол.

І перавярнуў чарадзей таго гультая ў мядзведзя.

Дык вось адкуль узяўся мядзведзь. А хто не верыць — няхай зловіць мядзведзя і распытае ў яго, ці так гэта было, як казка кажа.

**3. Гутарка па змесце казкі.**

*Прыкладныя пытанні да выхаванцаў:*

Ці спадабалася вам казка? Пра каго ў ёй гаворыцца? Хто такі гультай? Для чаго хацеў сустрэцца гультай з чараўніком? За што пераўтварыў чараўнік гультая ў мядзведзя? Якую благую работу рабіў гультай? Ці можна сябе паводзіць у адносінах да іншых людзей так, як гультай? *(Адказы дзяцей.)*

**4. Гульня «Пчолы і мядзведзь».**

*Персанажы*: 5 гульцоў — вуллі, 1 — мядзведзь, усе астатнія — пчолы. У кожнага з выхаванцаў маска ў адпаведнасці з абранай роляй.

*Правілы гульні:* гульцы-вуллі размяшчаюцца па пакоі ў адвольным парадку, пчолы становяцца колам вакол свайго вулля, мядзведзь спіць.

*Ход гульні.* Пры словах вядучага: «Сонейка свеціць» — пчолы ляцяць па мёд (дзеці адвольна рухаюцца па пакоі), гудуць. Пры словах вядучага: «Дождж пачынаецца» — вяртаюцца да сваіх вулляў і размяшчаюцца вакол. Пчолы вяртаюцца толькі да сваіх вулляў.

Пры словах вядучага: «Мядзведзь прачнуўся!» — мядзведзь пачынае прабірацца да вулляў, каб пачаставацца мёдам — дакрануцца да вулея.

Задача пчол — хутчэй за мядзведзя дабегчы да свайго вулея і, стварыўшы кола (узяўшыся за рукі), абараніць яго, танцуючы або рухаючыся ў карагодзе пад музычнае суправаджэнне. У гэтым выпадку мядзведзь не можа дакрануцца да вулея. Пасля двух-трох цыклаў гульні гульцы мяняюцца ролямі.

Перамагае тая каманда пчол, якая даўжэй за ўсіх будзе трымаць абарону свайго вулея.

**5. Працяг гутаркі з дзецьмі на тэму «Зосім — ахоўнік пчол».**

— Цяпер займаюцца развядзеннем пчол пчаляры. Можа, вы бачылі дзе жывуць пчолы? Пчаляры выкарыстоўваюць спецыяльнае адзенне (*дэманстрацыя адзення*), пальчаткі, дымары (*дэманстрацыя выявы*). Навошта пчалярам такое спецыяльнае адзенне і прыстасаванні? *(Адказы дзяцей.)* Як вы лічыце, якую карысць прыносяць пчолы чалавеку? *(Адказы дзяцей.)* Мёдам любяць паласавацца не толькі людзі, але і жывёлы, таму што ён смачны, духмяны.

**6. Дэгустацыя мёду з апісаннем яго якасцей.**

**7. Сумесная творчая работа — калаж «Пасека».**

Дзеці дзеляцца на дзве групы і па загадзя падрыхтаваных трафарэтах выразаюць з каляровай паперы вуллі, пчолак, кветкі. Затым выразаныя вырабы прымацоўваюцца да вялікага аркуша паперы. Групы працуюць за рознымі сталамі, каб не перашкаджаць адна адной падчас праектавання сваёй пасекі.

Пасля выканання работы праводзяцца выніковая гутарка і выстава работ.